Тацццяна ЛАЎРЫК,
загадчык аддзела бібліятэказнаўства Мінскай абласной бібліятэкі імя А. С. Пушкіна

# НА РАДЗІМЕ ПАЎЛЮКА ТРУСА

З творчасцю Паўлюка Труса (1904–1929), паэта, публіцыста, сябра літаратурнага аб'яднання "Маладняк", я блізка пазнаёмілася падчас святкавання ў 2019 г. 115-годдзя з дня яго нараджэння, калі пачыналася рэалізацыя Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі праекта "На хвалі часу, у плыні жыцця" (2019–2023). У рамках ініцыятывы, супольнай з Дзяржаўным музеем гісторыі беларускай літаратуры, была падрыхтавана выстава кніг і дакументальных матэрыялаў з фондаў музея і бібліятэкі і арганізавана аўтарская лекцыя "Здароў, Паўлюк".

Калі трапляеш на радзіму паэта, гутарыш з людзьмі, якія захоўваюць памяць пра земляка, асоба мастака слова, яго творы становяцца больш зразумелымі. Менавіта ў 2019 г. на прасторах інтэрнэту я натрапіла на інфармацыйны рэсурс – віртуальны музей Паўлюка Труса, створаны Уздзенскай цэнтральнай раённай бібліятэкай імя П. Труса ў 2015 г., дзе сабрана ўся інфармацыя пра яго. З ініцыятывы яго пляменніцы Марыі Міхайлаўны Крупнік дзеля ўшанавання памяці паэта і іншых знакамітых ураджэнцаў в. Нізок супрацоўнікамі раённай бібліятэкі быў створаны інфармацыйны стэнд, устаноўлены 1 кастрычніка 2022 г. пры ўездзе ў вёску.



**На адвароце здымка дарчы надпіс: «Адаму Бабарэку на добрую памяць ад сябра Усебеларускага аб'яднання паэтаў і пісьменнікаў "Маладняк" П. Труса. Закалосіць свабодным уздымам маладога жыцця акіян. 24/X 25 г.».** *З фондаў Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва.*

Нарадзіўся Паўлюк Трус 6 мая 1904 г. у вёсцы Нізок на Уздзеншчыне, адкуль родам яшчэ адзін знакаміты сябра "Маладняка" – Кандрат Крапіва (1896–1991). Хлопчык паходзіў з небагатай сям'і, ужо з дзесяці гадоў ён далучыўся да цяжкай працы земляроба. "*У дзесяць гадоў,* – казаў Паўлюк Трус сябру Міколу Хведаровічу, – *я ўжо хадзіў за бараною. Бацька сеяў, а я па свежых слядах баранаваў і не толькі баранаваў, а нават пад'язджаў на баране, за што ад бацькі часта пападала па вушах. У дванаццаць гадоў я браў першыя ўрокі на аратага, праца куды менш цікавая, бо патрабавала пільнасці і вялікай увагі. У пятнаццаць гадоў я моцна трымаў касу ў руках і, як спрактыкаваны мастак, добра вымалёўваў шырокія пракосы на нашых прынёманскіх лугах, крыху пазней вазіў з бацькам узімку лес да Вусы на сплаў*".

Бацькі паэта былі непісьменнымі сялянамі, у сям'і лічылася, што навука дзецям непатрэбная, але Паўлюк цягнуўся да вучобы. У вясковай школе хлопец здзіўляў настаўніка стараннасцю і кемлівасцю. Акрамя паэтычнага таленту з дзяцінства праяўляў здольнасці да спеваў і малявання. У фондах Уздзенскага раённага гісторыка-краязнаўчага музея захоўваецца рукапіс Паўлюка – сшытак-газета "Низокская жизнь" (кн. 1; ліпень 1922 г.), на старонках якой малюнкі паэта. Толькі тут, на яго радзіме, можна пабачыць арыгінал выдання.

Пасля таго, як Паўлюк закончыў вясковую школу, бацька адвёз яго ў мястэчка Узда, дзе было народнае вучылішча. Там ён пазнаёміўся і пасябраваў з Пятром Глебкам і Алесем Якімовічам. Часта сустракаючыся, хлопцы чыталі свае прыпеўкі і вершы, некаторыя з іх змяшчалі ў насценгазету. Адна з мар сяброў была падацца ў Мінск вучыцца на настаўнікаў. Але пачалася грамадзянская вайна: з абозам для патрэб арміі П. Трус даехаў амаль да Варшавы, у дарозе зведаў шматлікія выпрабаванні, хвароў.

Пасля вайны юнацкая мара спраўдзілася: з 1923 г. П. Трус пачаў вучобу ў Беларускім педагагічным тэхнікуме ў Мінску, дзе ярка вылучаўся сярод навучэнцаў.

Першы Белпедтэхнікум быў адчынены ў г. Мінску ў 1921 г., да 1931 г. ён насіў імя У. М. Ігнатоўскага. Сярод настаўнікаў былі вядомыя дзеячы літаратуры і навукі: Якуб Колас, Язэп Лёсік, Уладзімір Тэраўскі, Аляксандр Круталевіч і іншыя. Тут навучаліся многія будучыя сябры літаб'яднання "Маладняк": Валера Маракоў, Пятро Глебка, Максім Лужанін, Наталля Вішнеўская, Зінаіда Бандарына, Сяргей Дарожны і іншыя. Фактычна палова аўтараў маладой беларускай літаратуры пачыналі адсюль шлях.

Тут П. Трус спяваў у студэнцкім хоры, ставіў п'есы, у якіх быў і акцёрам, маляваў дэкарацыі і рэдагаваў насценную газету, а таксама друкаваўся ў перыядычных выданнях і займаўся апрацоўкай фальклорна-паэтычных матэрыялаў для кампазітараў У. Тэраўскага, Н. Сакалоўскага, Р. Пукста, І. Любана. Ён быў адным з удзельнікаў вечароў паэзіі, якія кожную суботу праходзілі ў Белпедтэхнікуме. І меў тут найбольшы поспех, бо амаль усё чытаў на памяць, чым здзіўляў слухачоў. Яго вершы вызначаліся жыццесцвярджальнасцю, пераліўчастасцю – чыстай, як крынічны струмень, і шчырай, як народная песня, што неадступна ішла поруч.

1925 год для П. Труса стаў вельмі актыўным: паэт быў прыняты ў літаратурнае аб'яднанне "Маладняк"; друкаваўся ў часопісах "Маладняк" і "Малады араты", газетах "Беларуская вёска", "Чырвоная змена"; выдаў зборнік паэзіі "Вершы" ў серыі «Кніжніца "Маладняка"»; удзельнічаў у першым з'ездзе літаратурнага аб'яднання, дзе быў абраны ў сакратарыят. У 1926 г. услед за групай пісьменнікаў спрабаваў пакінуць "Маладняк", каб далучыцца да згуртавання "Узвышша", аднак пасля парад Платона Галавача, Міхася Чарота і Міхася Зарэцкага вярнуўся ў арганізацыю. Пасля заканчэння Белпедтэхнікума Цэнтральнае бюро "Маладняка" прапанавала паэту рэдактарскую пасаду ў Мінску, але ён вырашыў з'ехаць са сталіцы. Уладкаваўся на вольную пасаду сакратара гомельскай газеты "Новая деревня", дзе актыўна займаўся творчасцю і быў уключаны ў грамадскае жыццё.



**Дарожная скрыня Паўлюка Труса.** *З фондаў Уздзенскага раённага гісторыка-краязнаўчага музея. Фота Т. Лаўрык.*



**Старонка з сшытка-газеты "Низокская жизнь".** *З фондаў Уздзенскага раённага гісторыка-краязнаўчага музея. Фота А. Данільчык.*

У верасні 1928 г. П. Трус вярнуўся ў Мінск, стаў студэнтам літаратурна-лінгвістычнага аддзялення педагагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Гэта выключны выпадак у гісторыі сусветных літаратур: хлопцу давялося ва ўніверсітэце вывучаць творы самога сябе, бо на той час ужо быў вядомым паэтам.

Усяго 25 гадоў было Паўлюку, калі ён захварэў на тыф і памёр 30 жніўня 1929 г. Выратаваць юнака ўрачы не змаглі, бо позна звярнуўся па дапамогу. Правесці яго ў апошні шлях прыйшло шмат людзей, якія неслі мноства вянкоў з кветак. Пахаваны паэт на Вайсковых могілках у Мінску.

Лёс Паўлюка Труса можна параўнаць з лёсам класіка беларускай літаратуры Максіма Багдановіча. Такі ж працаздольны, няўрымслівы, з кароткім жыццёвым лёсам і яркім талентам, які пакінуў прамяністы след у гісторыі айчыннай літаратуры.

З 1960 г. Цэнтральная раённая бібліятэка Уздзенскага раёна носіць імя Паўлюка Труса. Літаратурная гасцёўня "У Паўлюка", створаная ў 2015 г., стала своеасаблівым брэндам установы. Гэтаму садзейнічала вялікая пошукова-даследчая праца, якая доўжылася не адзін год. Бібліятэкай назапашаны немалы вопыт краязнаўчай працы, не адно дзесяцігоддзе яе спецыялісты збіралі дакументы пра жыццёвы і творчы шлях паэта: кнігі, артыкулы, фотаздымкі, аўдыявізуальныя матэрыялы. Была створана тэматыч-



**Пахаванне Паўлюка Труса ў Мінску.** 1929 г. *З фондаў Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва.*

ная папка "Песняю славіў жыццё", прысвечаная паэту, якая ўвесь час папаўняецца новымі матэрыяламі з газет і часопісаў. У гасцёўні можна пазнаёміцца з кнігамі П. Труса 1920–1930-х гг. Захоўваецца тут выданне "Вершы" з аўтографам сястры паэта Веры Адамаўны Трус ад 27 жніўня 1959 г. Трусаўскі фонд бібліятэкі папаўняецца дзякуючы супрацоўніцтву з абменна-рэзервовым фондам Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

У віртуальным музеі паэта на сайце Уздзенскай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя П. Труса (uzdalib.by) таксама кожны год дадаецца новых матэрыялаў. Напрыклад, у Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва захоўваецца фотаздымак з пахавання П. Труса, яго скан стаў добрым набыткам рэсурсу. У 2023 г. віртуальны музей атрымаў дыплом 2-й ступені ў абласным конкурсе Мінскай вобласці на стварэнне найлепшага віртуальнага рэсурсу пра пісьменніка-земляка на сайце бібліятэкі ў рамках праекта "Пісьменнікі – ураджэнцы роднага краю" (2022–2023).

Установа супрацоўнічае з Уздзенскім раённым гісторыка-краязнаўчым музеем, дзе экспануюцца асабістыя рэчы П. Труса: дарожная скрыня, пенал і лубяная скарбонка, рукапіс – сшытак-газета "Низокская жизнь" (кн. 1; ліпень 1922 г.). Падтрымліваецца сувязь з Марыяй Міхайлаўнай Крупнік, пляменніцай паэта, якая жыве ў вёсцы Нізок і заўсёды гатова ўдзельнічаць у розных ініцыятывах бібліятэкі, прысвечаных ушанаванню памяці творцы.

Кожны год на дзень нараджэння пісьменніка ў маі ўстанова рыхтуе шэраг мерапрыемстваў, якія знаёмяць землякоў і гасцей раёна з жыццём і творчасцю П. Труса. У 2023 г. літаратурна-музычнае свята "У вянок песняру" прайшло сумесна з Мінскай абласной бібліятэкай імя А. С. Пушкіна, Беларускім дзяржаўным архівам-музеем літаратуры і мастацтва і часопісам "Полымя". Бібліятэку наведалі пісьменнікі, літаратуразнаўцы і архівісты. Тут гучалі вершы паэта ў выкананні вучняў Уздзенскай гімназіі, госці расказалі, якое значэнне мае асоба Паўлюка Труса для кожнага з іх.

У маі 2024 г. бібліятэка г. Узды рыхтуецца адзначыць 120-годдзе з дня нараджэння Паўлюка Труса, гэтага шчырага, светлага паэта, які прысвячаў роднаму куточку вершаваныя радкі.

## КАЛЯНДАР ПАМЯТНЫХ ДАТАЎ І ЮБІЛЕЙНЫХ ДЗЁН на 2024 год

## МАЙ

**1 мая** – 110 гадоў з дня нараджэння Алены Ленсу (1914–2005), літаратуразнаўцы, крытыка

90 гадоў з дня нараджэння Якава Касалапава (1934–1982), кампазітара

90 гадоў з дня нараджэння Міколы Корзуна (1934–1995), празаіка

75 гадоў з дня нараджэння Ядвігі Паплаўскай, спявачкі, кампазітара, народнай артысткі Беларусі

**2 мая** – 90 гадоў з дня нараджэння Аляксея Гардзіцкага (1934–1999), крытыка

70 гадоў з дня нараджэння Кастуся Жука, паэта

**3 мая** – 75 гадоў з дня нараджэння Віктара Крука, мастака, педагога

**4 мая** – 225 гадоў з дня нараджэння Фларыяна Бохвіца (1799–1856), філосафа-мараліста, пісьменніка

105 гадоў з дня нараджэння Пятра Шасцерыкова (1919–1994), празаіка, перакладчыка, публіцыста

**5 мая** – 205 гадоў з дня нараджэння Станіслава Манюшкі (1819–1872), кампазітара, дырыжора, педагога

90 гадоў з дня нараджэння Мікалая Казакевіча (1934–2021), мастака

80 гадоў з дня нараджэння Аляксандра Дзянісава (1944–2012), акцёра

80 гадоў з дня нараджэння Дзмітрыя Сарокі (1944–2022), мастака, педагога

*Заканчэнне на с. 76.*